Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Не акцэнтуйце сваю ўвагу на дробязях, а засяродзьцеся на самым галоўным. Вы зараз таварыскія і лёгкія на ўздым. Будзе шмат сустрэч з сябрамі і знаёмымі, запланаваных і незапланаваных. Паспрабуйце, нягледзячы на аптымістычны настрой, рэальна ацаніць сілы і не перагружаць сябе лішнімі клопатамі. І не варта шукаць у працы суцяшэнне ад праблем у асабістым жыцці.

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні вы можаце быць асабліва летуценныя. Усё б нічога, але мары вашы будуць мець не самую практычную скіраванасць, некаторыя наогул могуць аказацца вельмі дзіўнымі. Ці варта іх ажыццяўляць? Падзеі, якія адбудуцца ў сярэдзіне тыдня, могуць пазбавіць вас ад парачкі застарэлых комплексаў. У канцы тыдня магчымыя прыгоды, якія, зрэшты, не тояць у сабе асаблівай небяспекі.

БЛІЗНЯТЫ. Вы, падобна, цяпер трохі хвалюецеся, але не варта дазваляць эмоцыям атрымаць перамогу, дакажыце, хто сапраўдны гаспадар становішча. Здолееце зрабіць правільны выбар і адчуць спакой і гармонію. Зоркі прадказваюць шлюб і прыбаўленне ў сямействе.

РАК. На гэтым тыдні давядзецца адстойваць свае інтарэсы, а гэта часам вельмі няпроста. У панядзелак з'явяцца новыя дзелавыя партнёры, будзьце з імі сумленнымі і непрадузятымі. У чацвер сваякам можа спатрэбіцца дапамога. У пятніцу пастарайцеся кантраляваць сітуацыю і дзейнічаць разумна. У суботу не сядзіце дома, ідэальны варыянт — правесці гэты дзень у гасцях, адправіцца на прагулку або ў кіно.

ЛЕЎ. Тыдзень прынясе новыя мэты і жыццёвыя ўстаноўкі. Старайцеся не марнаваць каштоўны час. Усё задуманае здзейсніцца, калі вы спакойна і сумленна будзеце рабіць сваю справу. Не варта пачынаць новыя праекты ў панядзелак. Не ганіцеся за двума зайцамі. Паспрабуйце стварыць камфортную абстаноўку дома, не варта высвятляць адносіны з блізкімі.

ДЗЕВА. Працы будзе шмат, прычым самай разнастайнай, таму адна з важных задач тыдня — выбраць першачарговыя справы і тое, што можна адкласці. Неабходна навучыцца адстойваць свае інтарэсы. У сераду сябры змогуць дапамагчы ў важнай справе. У чацвер старайцеся не прымаць паспешлівых рашэнняў: спачатку ўсё добра прадумайце. У суботу будуць паспяховымі паездкі і падарожжы.

ШАЛІ. Пажадана не ўпадаць у роспач і не шкадаваць сябе. Шукайце ва ўсім пазітыў. Магчыма, будзе мяняцца ваш погляд на пэўныя матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці. І гэта можа станоўча адбіцца на вашым лёсе. У калектыў, дзе вы працуеце, могуць прыйсці энергічныя людзі. Ёсць шанц сумеснымі намаганнямі шмат чаго дабіцца. Частка планаў адносна гэтага тыдня можа быць парушаная неспадзяванымі акалічнасцямі. Не хвалюйцеся, будзе выдатная магчымасць рэалізаваць свае задумы трохі пазней.

СКАРПІЁН. На гэтым тыдні скрытыя праблемы стануць відавочнымі, а значыць, іх тэрмінова трэба вырашаць. Тым самым вы пазбавіце сябе ад сур'ёзных цяжкасцяў у будучыні. Зразумееце, што ў цэлым усё складваецца добра. З'явіцца энергія і жаданне працаваць, кахаць, ствараць. У пятніцу вас чакае прыемная сустрэча. Нядзеля — добры дзень для сяброўскіх зносін.

СТРАЛЕЦ. Надыходзіць досыць добры перыяд, але памятайце, што канкурэнты не дрэмлюць. Не варта дэманстраваць усім і кожнаму свае слабыя і ўразлівыя месцы. Рашучасць — гэта выдатна, але ўсё ж часам лепш стрымаць свае парывы. Важна з розумам размеркаваць сілы, накіраваць іх на здабыццё душэўнай раўнавагі. Давярайце інтуіцыі. У суботу можаце парадаваць сябе і навакольных цікавымі ідэямі і нечаканымі рашэннямі.

КАЗЯРОГ. У пачатку тыдня магчыма парушэнне абавязацельстваў з боку партнёраў і, як вынік, канфлікт. Не варта яго развіваць. Дзеля чаго лішні раз паказваць людзям, што яны перад вамі вінаватыя? Атрымаецца ўсё ўладзіць. У сераду магчымы ўскладненні ва ўзаемаадносінах з кіраўніцтвам. Выкрываючы недахопы іншых людзей, памятайце і пра ўласную недасканаласць. Не забывайце, што крытыка павінна быць канструктыўнай.

ВАДАЛІЎ. Можаце быць усур'ёз загружаныя працай, давядзецца ўнікаць у мноства разнастайных пытанняў і прымаць адказныя рашэнні ў самых розных галінах. Затое ўмацуеце свой аўтарытэт. Надыходзіць час перагляду каштоўнасцяў. Пачніце з сябе — вось каго вы відавочна недаацэньвалі. Спатрэбіцца праявіць настойлівасць і ўпэўненасць, выдаткаваць нямала сіл на перакананне калег у сваёй праваце.

РЫБЫ. Перш чым прыняць прапанову, неабходна ўсё прадумаць. Важна ўбачыць сутнасць за прыгожай упакоўкай. У аўторак паспрабуйце не ўлазіць у канфлікты на працы, без вас разбяруцца. У пятніцу сітуацыя, відаць, кардынальна зменіцца, у гэты дзень давядзецца прыняць сур'ёзнае рашэнне, ад якога могуць залежаць вашы перспектывы на найбліжэйшую будучыню. Сумневы ва ўласных сілах знікнуць, а гэта будзе садзейнічаць павышэнню працаздольнасці.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.38	17.10	8.32
Віцебск —	8.33	16.54	8.21
Магілёў —	8.28	16.59	8.31
Гомель —	8.19	17.02	8.43
Гродна —	8.53	17.26	8.33
Брэст —	8.47	17.33	8.46

Месяц

Першая квадра 15 лістапада.
Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Еўдакіі, Аляксандра, Вікенція, Георгія, Іосіфа, Мікалая.*
К. *Гертруды, Марка.*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

16 ЛІСТАПАДА

У краіне

1884 год — у Мінску заснаваны Беларускі дзяржаўны цырк як стацыянарны цырк-шапіто. З 1958 года называўся Мінскі дзяржаўны цырк, з 1997 года — Беларускі дзяржаўны цырк.

1905 год — нарадзіўся (вёска Труханавічы, цяпер у Капыльскім раёне) Ян Скрыган, беларускі пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі. Працаваў у Дзяржаўным выдавецтве Беларусі, у часопісе «Полымя», загадчыкам рэдакцыі ў «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі». У 1975—1985 гадах — адказны сакратар Камітэта па Дзяржаўных прэміях Беларусі ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Аўтар кніг «Затока ў бурах», «Скажы адно слова», «Свая аповесць» і іншых. Пераклаў на беларускую мову кнігі і асобныя творы І. Буніна, М. Горкага, К. Федзіна, украінскіх, літоўскіх, латышскіх і эстонскіх аўтараў. У 1936 годзе рэпрэсаваны і высланы ў Кемераўскую вобласць. Рэабілітаваны ў 1954 годзе. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі за ўдзел у стварэнні «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі». Памёр у 1992 годзе.

1924 год — у Мінску на беларускай мове штомесяц пачаў выдавацца грамадска-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс «Работніца і калгасніца Беларусі», з 1946 года — «Работніца і сялянка», з 1995-га — «Алеся». Асвятляе пытанні жыцця, працы, грамадскай дзейнасці жанчын Беларусі.

1937 год — нарадзіўся (г. Полацк) Валянцін Антонавіч Лукша, беларускі паэт. Аўтар кніг паэзіі «Гарады нараджаюцца сёння», «Споведзь», публіцыстыкі, твораў для дзяцей «Аркестр», «Зялёная бальніца» і іншых. Выступаў як сатырык і гумарыст. Працаваў карэспандэнтам Беларускага радыё, загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Чырвоная змена». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2012 годзе.

1953 год — нарадзіўся (г. Бабруйск) Аляксандр Пракапенка, беларускі спартсмен (футбол). Бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў (1980). Чэмпіён СССР у складзе мінскага «Дынама» (1982). У чэмпіянатах СССР правёў 168 матчаў, забіў 52 галы, у складзе мінскага «Дынама» — 163 гульні, 51 гол. Памёр у 1989 годзе.

У свеце

42 год да н. э. — нарадзіўся Тыберый Клаўдзій Нерон, у часы якога, паводле Бібліі, быў укрыжаваны Ісус Хрыстос. Ён быў першым дзіцем у сям'і Нерона Старэйшага, які належаў да галіны старажытнага патрыцыянскага роду Клаўдзіяў.

1945 год — у Лондане ўстаноўчая канферэнцыя прадстаўнікоў 44 краін зацвердзіла Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА).

УСМІХНЕМСЯ

Падрыхтаваўся да вяртання жонкі з адпачынку: памыў усю бялізну, вымыў тры разы падлогу, вынес смецце, перамыў на ўсялякі выпадак нават чысты посуд, распырскаў цэлы балон асвяжальніка паветра, каб не пахла тытунём, выліў па вядры вады ў кветкі, замовіў вячэру ў самым дарагім рэстаране на дом, вымыў ката, а яна ходзіць па пакоях, цокае языком і толькі прыгаворвае:

— Гэта ж трэба так за два тыдні загадзіць кватэру!..

Калі я ляжу, я выглядаю больш худым. Думаю, што мне трэба больш ляжаць.

Дыялогі ў сеціве:

— А які ў вас целасклад?

— Спартыўны.

— А якім відам спорту займаецеся?

— Сумо.

Калі няма грошай — мы робім выгляд, што яны ў нас ёсць. Калі ёсць грошы — мы робім выгляд, што іх у нас няма.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4168. Нумар падпісаны ў 19.30 15 лістапада 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12